ЗАЦВЕРДЖАНА

Кiраўнiк рабочай групы
Нацыянальнага сходу
Рэспублiкi Беларусь па справах
беларусаў замежжа

___________ Гаўрылoвiч У.М.
«09» снежня 2024 г.

# ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзеннi медыяконкурсу "Мы – разам! Ганаруся маёй Беларуссю!", прысвечанага 80-годдзю Перамогi ў Вялiкай Айчыннай вайне, сярод членаў грамадскiх арганiзацый беларусаў замежжа

## 1. Асноўныя мэты i задачы конкурсу

Конкурс праводзiцца дзеля:

далучэння членаў грамадскiх арганiзацый беларускiх суайчыннiкаў за мяжой да папулярызацыi культурнай спадчыны беларускага народа, дасягненняў у галiне беларускай лiтаратуры у краiнах iх пражывання, падтрымкi сямейнай творчасцi, падтрымкi i заахвочвання ў ажыццяўленнi iмi культурна-асветнiцкай дзейнасцi, умацавання станоўчага iмiджу Беларусi i беларускага народа ў свеце.

## 2. Арганiзатар конкурсу

Парламенцкая рабочая група па справах беларусаў замежжа.

Конкурс праводзiцца пры падтрымцы:
Мiнiстэрства замежных спраў Рэспублiкi Беларусь;
Мiнiстэрства культуры Рэспублiкi Беларусь;
Дзяржаўнай ўстановы культуры змешанага тыпу "Рэспублiканскi цэнтр нацыянальных культур".

У якасцi партнёраў конкурсу могуць выступаць дзяржаўныя i грамадскiя арганiзацыi Рэспублiкi Беларусь, фiзiчныя i юрыдычныя асобы, якiя засноўваюць свае заахвочвальныя прызы ўдзельнiкам конкурсу цi iншым чынам спрыяюць рэалiзацыi данага праекта.

## 3. Намiнацыi i ўдзельнiкi конкурсу

1. **Намiнацыя "Мой любiмы вершаваны твор"** (вiдэазапiс чытання напамяць вершаў, прысвечаных гераiчным падзеям Вялiкай Айчыннай вайны, створаных класiкамi беларускай савецкай лiтаратуры i сучаснымi беларускiмi аўтарамi; вершы - на выбар чытальнiкаў).

У намінацыі прымаюць удзел: члены грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа.

2. **Намінацыя “Песня маёй сям'і”** (відэазапіс выканання беларускай народнай (аўтарскай) песні).
   У намінацыі прымае ўдзел: сямейны гурт выканаўцаў (не менш 3 прадстаўнікоў канкрэтна ўзятай сям'і беларусаў, якая з'яўляецца членам грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа).

## 4. Умовы ўдзелу, тэрміны

Матэрыялы на ўдзел у конкурсе "Ганаруся маёй Беларуссю!" накіроўваюцца **з 1 студзеня па 1 кастрычніка 2025 года** на электронную пошту Belarus.konkurs@house.gov.by і ўключаюць у сабе:

заяўку адвольнай формы (*яе могуць падаваць самі ўдзельнікі ці грамадскія арганізацыі беларусаў замежжа*) з дакладнымі звесткамі пра ўдзельнікаў (*чытальнікаў і ўдзельнікаў сямейнага гурта*), краіну, адрас іх пражывання, звесткамі пра прадстаўляемае грамадскае аб'яднанне беларусаў замежжа, кантактамі ўдзельнікаў. Абавязкова неабходна ўказваць у заяўцы аўтарства паэтычнага твора, выбранага для чытання, аўтарства песні (калі ёсць);

відэазапіс чытання мастацкага твора (не больш 3 хвілін);

відэазапіс выканання народнай (аўтарскай) песні (не больш 3,5 хвалін).

Адным чытальнікам ці адным сямейным гуртом могуць быць прадстаўлены на конкурс не болей 2 відэазапісаў у фармаце MP4, AVI.

## 5. Падвядзенне вынікаў, журы, узнагароджванне

Па меры паступлення на электронную пошту Арганізатара відэазапісы размяшчаюцца на старонках групы “Беларусы свету” ў Facebook, такім чынам прадстаўляюцца шырокаму колу слухачоў і гледачоў.

У склад журы ўваходзяць: кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу па справах беларусаў замежжа Гаўрыловіч Уладзімір Мікалаевіч (старшыня журы) і члены рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа. Да ўдзелу ў працы журы могуць быць запрошаны прадстаўнікі Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, зацікаўленых міністэрстваў і Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, а таксама пісьменнікі, артысты, дзеячы культуры краіны.

Падвядзенне вынікаў конкурсу праводзіцца на працягу месяца з моманту спынення прыняцця заявак.

У кожнай з намінацый вызначаюцца пераможцы – 1, 2, 3 месца.

Пераможцы ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі I, II, III ступені Рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа.

Лепшыя ўдзельнікі (сямейныя гурты) конкурсу могуць быць адзначаны іншымі ўзнагародамі ўстаноў-партнёраў і  падтрымліваючых конкурс мецэнатаў.

Спецыяльныя дыпломы  па меры магчымасці могуць быць уручаны на асобнай урачыстасці  ці перасылаюцца пераможцам у электроннай форме на адрас, з якога яны дасылалі на конкурс заяўку і відэазапіс.

Арганізатар  не пазней 1 лістапада інфармуе канкурсантаў і зацікаўленых аб выніках конкурсу праз размяшчэнне адпаведнай інфармацыі на старонках групы “Беларусы  свету” ў Facebook.